Д.А. Дрожжа

## СМЕРЦЬ ВА ЎЯЎЛЕННІ ВАРВАРСКАГА ВОІНА І СЯРЭДНЯВЕЧНАГА РЫЦАРА

Сярэднявечча зрабіла новы крок у развіцці вайсковага майстэрства. З'явіўся зусім новы феномен вайсковага саслоў'я – рыцарства. Адна з галоўных частак, што складае светаўспрыманне воіна, гэта яго ўспрыняцце смерці. Бо няма сапраўднага воіна, калі той палохаецца яе. Менавіта смерць і ўспрымалася па-рознаму.

Ва ўмовах падзелу грамадства па прынцыпу «мы» і «яны» іначай быць не магло. Да чужога і невядомага заўсёды адносіліся з перасцярогай, і адсюль узнікненне розных канфліктаў, якія звычайна вырашаліся зброяй. Таму часцей за ўсё смерць чакала воіна падчас бойкі, і ён заўсёды рыхтаваўся да яе і не палохаўся смерці: «... приближалась битва // слава близилась // время пришло // пасть избранником израненым // на поле брани //» [1].

Перад смерцю яго хвалююць толькі асабістыя паводзіны, толькі словы, што ён скажа перад яе змрочным выглядам.

Але ў воіна ёсць не толькі пачуццё смерці, але і веданне пра яе. Людзі не ўсе давяраюць дрэнным прыкметам і снам. Менавіта яны кажуць пра хуткую гібель. Але ведаючы пра смерць, воін ніколі не адмаўляецца ад паедынка. І гэта нават не павяргае яго ў стан фаталістычнай апатыі. Нягледзячы ні на што ён усё ж такі кідае выклік лёсу. Лейтматывам шматлікіх саг могуць служыць словы: «Цяжка змяніць тое, што павінна адбыцца, але трэба змагацца да апошняга».

Усё ж такі цяжка перамагчы лёс, герой гіне. Але пасля яго застаецца слава, тым больш, што ён загінуў гераічна. А смерць – гэта момант, калі герой робіць пераход у мір славы, бо толькі са смерцю воін дасягае нейкай канчатковасці. У саге пра Ньела добра бачна гэтая канчатковасць. Вісай, якую складаюць пасля гібелі героя, падкрэсліваюць момант заканчэння зямнога жыцця: «Ведомо нам, как в доме // Недругов Гуннар встретил // Копьем отражая натиск // Кормчих коня морского // В буре огней Одина // Шестнадцать ратников ранил // и двух убил наповал // Славный дробитель гривен //» [2].

У адрозненні ад варварскага воіна, рыцар бачыў некалькі іншае заканчэнне свайго існавання. Па-першае, ён павінен быў змагацца са злом, якое ўвасабляў Сатана. Суадносна ён станавіўся боскім воінам і меў вялікі шанец атрымаць за сваю верную службу вечнае жыццё. Па-другое, у класічным сярэднявеччы вайна ўспрымалася як своеасаблівая гульня. У апісанні бітваў увесь час дамінуюць яркія фарбы ў спалучэнні з ліючайся крывёю. Знакаміты трубадур Бертран де Борн нават захапляецца гэтым: «Милей – глазами по лугам // Считать шатры и здесь и там // и, схватки ожидая // Скользить по рыцарским рядам // и по оседланным коням» [3]. Па-трэцяе, удзелы ў вайсковых выправах неслі іншы канец, чым смерць. Галоўнае для рыцара – гэта магчымасць выказаць як мага больш доблесці: выбіць болей праціўнікаў з сядла, у ідэале пабіцца з некалькімі супернікамі і ... трапіцца ў палон. Так змагаўся французскі кароль Іаан Добры ў бітве пры Пуац'е.

Такім чынам, мы выявілі, што існавалі адрозненні ва ўспрыманні смерці. Фон, на якім адбываліся падзеі, у варвара змрочны і поўны трагізму. І наадварот, рыцарскі фон мяккі і поўны яркіх фарбаў. Тут наогул рэдка думаеш пра смерць. Невыпадкова ў эпічных творах германцаў жыцці герояў і іх паедынкі носяць трагічны характар і толькі пасля смерці адчуваецца больш светлая афарбоўка падзей, бо воін дасягнуў вечнай славы. У рыцарскіх раманах усё наадварот. Жыццёвы шлях напоўнены светам і цеплынёй, а вось смерць наганяе смутак на герояў. Але каб падрабязней пабачыць гэта, трэба азнаёміцца са скандынаўскімі сагамі, рыцарскімі раманамі і міфалогіяй германцаў.

### Літаратура

1. Битва при Мэлдоне // Древнеанглийская поэзия. – М.: Наука, 1982. – С.143.
2. Сага о Ньяле // Исландские саги. – М., 1973. – С.277.
3. Поэзия трубадуров, минезингеров, вагантов. – М., 1974. – С.94.